УДК 808. 26 (053)

***В.І. Рагаўцоў***

# ВЕРБАЛЬНЫЯ СРОДКІ КАМІЧНАГА Ў П'ЕСЕ «ВІНО БУШУЕ» МІХАЙЛЫ ГРАМЫКІ

У артыкуле разглядаюцца як спецыялізаваныя, так і неспецыялізаваныя вербальныя сродкі камічнага. Да спецыялізаваных адносяцца такія сродкі, для якіх функцыя стварэння камічнай экспрэсіі з'яўляецца асноўнай. Гэта каламбуры (паранамазійныя, камбінаваныя), іранізмы і гумарызмы. Іх можна кваліфікаваць як абсалютна спецыялізаваныя сродкі камічнага, паколькі яны выконваюць функцыю стварэння камізму ўсе без выключэння. Неспецыялізаваныя – такія сродкі, для якіх функцыя стварэння камічнага эфекту не з'яўляецца асноўнай. Гэта дыялектызмы, антрапонімы, метанімізмы, трасянка, эўфемізмы, збыткоўныя адзінкі. Выяўленню камічнай экспрэсіі ў моўнай адзінцы садзейнічаюць актуалізатары, у ролі якіх выступаюць сродкі прэ- і постпазіцыйнага вербальнага кантэксту. Камічны эфект узмацняецца з дапамогай інтэнсіфікатараў (канцэнтраванае ўжыванне моўных адзінак).

Літаратурную дзейнасць Міхайла Грамыка пачаў у 1907 г. (спачатку пісаў на рускай мове). Першая паспяховая спроба пісаць на беларускай мове – драма «Змітрок з Высокай Буды» (1918 г.). У тым самым годзе яна была надрукавана ў газеце «Вольная Беларусь» (29 верасня, 6 і 13 кастрычніка). Ён таксама аўтар п'ес «Скарынін сын з Полацка» (1925 г., пастаўлена ў 1926 г., рукапіс не знойдзены), «Над Нёманам» (1926 г.), «Каля тэрасы» (1927 г.), «Воўк» (1930 г.).

Камедыя «Віно бушуе» ўпершыню апублікавана ў «Полымі» (1929 г., № 7). Яна сведчыць пра камедыяграфічныя здольнасці М. Грамыкі: «багата насычана вясёлымі пасажамі, нечаканымі сюжэтнымі паваротамі і г.д.» [1, с. 13].

Для стварэння камічных сцэн і сатырычнай абмалёўкі персанажаў у п'есе выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя вербальныя сродкі і прыёмы.

***I. Каламбуры.*** Сустракаюцца дзве разнавіднасці каламбураў: паранамазійныя і камбінаваныя.

***1. Паранамазійныя каламбуры.*** Ужываецца каламбур, утвораны ў выніку фармальнага збліжэння паранамазаў – гідроніма і антрапоніма. (Пакуль яны сварацца, праходзяць Прасінская і Панаў, жвава гаворачы і паказваючы на шклянкі. Сцяпан (жэстам паказвае на іх). [Галёнка]: *Што? Што вы хочаце сказаць?* [Сцяпан]: *Што міма вас праплывае **Волга**.* [Галёнка]: *Як міма вас **Вольга**.* (Выходзіць сярдзіта.). Камізм (сарказм) каламбура абумоўлены не толькі абыгрываннем уласных імёнаў, але і рэалізацыяй полісемантам *праплывае* (вербальным у першай рэпліцы і «нулявым» у другой) двух значэнняў – прамога ('цячэ') і пераноснага (разм. жарт. 'праходзіць важнай, плаўнай паходкай').

***2. Камбінаваныя каламбуры.*** Для іх утварэння адначасова выкарыстоўваюцца розныя прыёмы: абыгрыванне значэнняў полісеманта і супастаўленне яго з блізкагучным кампанентам фразеалагізма: [Дзежка]: *Як гэта, што ёсць мясцкам? Мясцкам гэта... гэта па **саюзнай лініі**... Праўда, Лімпіядачка?* [Лімпіяда]: *Для мяне ўсе ў **лініі** роўныя. Я сама сабе сваю лінію вяду.* У рэпліцы Дзежкі *лінія* (саюзная) – перан. 'галіна якой-н. дзейнасці'. Недаказанае персанажам трэба разумець: *па саюзнай лініі прафсаюзаў = па прафсаюзнай лініі саюзнага маштабу.* Лімпіяда назоўнік *лінія* спачатку ўжывае ў прамым значэнні 'рыса на плоскасці, паверхні або ў прасторы' (актуалізатар – *усе ў... роўныя*). Потым гэты полісемант супастаўляецца з назоўнікавым кампанентам фразеалагізма *сваю лінію вяду* (разм. 'настойліва ажыццяўляю задуманае, раблю па-свойму'), што садзейнічае ажыўленню ўнутранай формы ўстойлівага выразу, актуалізацыі прамога (неідыяматычнага) значэння.

***ІІ. Іранізмы.*** Іранічнае ўжыванне моўных адзінак выяўляецца з дапамогай вербальных актуалізатараў:

1. [Бабіновіч]: *А не боязна? Тут, у лесе? Я ж,* ***як мядзведзь.*** *Ха-ха!* [Урбановіч]: *Таму і не боязна. Каб вы былі...* ***мужчынам спецыфічным...*** [Бабіновіч]: *Дык, значыць, я не мужчына? Вы ж мяне абражаеце?* Камізм дасягаецца ўжываннем іранізма *мядзведзь* – 'разм. 'няўклюдны, непаваротлівы чалавек' (так іранічна ацэньвае сябе Урбановіч, пра што сведчыць постпазіцыйны вербальны актуалізатар – выклічнік-рэдуплікат *ха-ха!*). Іранічны падтэкст мае выраз (калі вы былі...) *мужчынам спецыфічным...* (пра іранічнае ўспрыманне Бабіновічам гэтага выразу сведчыць яго рэпліка *Дык, значыць, я не мужчына?*).

2. [Сцяпан]: *Дзіўна толькі, што* ***адна слаўная дзяўчына*** *не з намі, Іван Іванавіч, што? Ха-ха-ха!* [Галёнка]: *Вы намякаеце на Прасінскую...* [Сцяпан]: *Волечку...* [Галёнка]: *Вы болей зацікаўлены ў* ***сей*** *асобе, таварыш Гаўрылік, наколькі я змог заўважыць...* З іранічным падтэкстам вымаўляецца Сцяпанам вылучанае словазлучэнне (актуалізатар – трыплікаваны выклічнік *ха-ха-ха!* Не застаецца «ў даўгу» і асістэнт Галёнка Іван Іванавіч, які не без іроніі імкнецца падкрэсліць, што менавіта студэнт Сцяпан Гаўрылік больш зацікаўлены (у) *сей* (асобе). Састарэлы рускамоўны займеннік *сей* ('гэтай') мае адценне ўзвышанасці, што ў дадзеным экспрэсіўна нейтральным кантэксце ўспрымаецца іранічна.

Трыплікаваны выклічнік *ха-ха-ха* з'яўляецца паказчыкам іранічнага ўжывання вылучанага спалучэння (састаўнога антрапоніма) і ў наступным прыкладзе: [Другая]: *Пойдзем туды, там скокі, цікава.* [Адна]: *Там і* ***Вольга Прасінская,*** *ха-ха-ха!* [Галёнка]: *Для мяне ўсе роўныя.* [Адна]: *Ну? Не верым, Іван Іванавіч!* (Цягнуць яго ў лес.)

Таццяна, наслухаўшыся ад Янкі, які імкнуўся пераканаць яе, што і ў правінцыі ёсць шмат чаго цікавага, у тым ліку і цікавыя людзі, так адрэагавала: *Ха-ха! Ёсць, ёсць тут цікавыя, нішто... Крыху дзівакі толькі.* Таццяніна ацэнка «цікавых», якая суправаджаецца выклічнікам-рэдуплікатам *ха-ха!*, была ўспрынята Янкам як іранічная, пра што сведчыць ягоная рэпліка: *Пра мяне вы?* На пытанне Таццяна адказала пытаннем: *А хоць бы і пра вас, тады што?* Гэтым самым яна дала знаць Сцяпану, хто ён ёсць насамрэч.

***ІІІ. Гумарызмы.*** Гэта вербальныя сродкі, з дапамогай якіх перадаюцца розныя адценні гумару, часам з лёгкай іроніяй. Пра ўжыванне ў наступных прыкладах моўных адзінак як гумарызмаў сведчаць рэмарка *смяецца*, ацэначныя словы ў рэпліках (рэдуплікаваныя або трыплікаваныя выклічнікі *ха-ха / ха-ха-ха*, дзеяслоў-кваліфікатар *жартую*):

1. [Алесь]: *Хай падымаецца* [лагер]. *Гляньце,* ***як сонца праз ліству смяецца, як вы, Тамарачка.*** [Тамара]: *А можа,* ***як вы, Алесь?*** *Ха-ха* (Смяецца.).

2. [Янка]: *Якраз я б так і трымаўся.* [Таццяна]: *Ха-ха-ха!* ***Я вас і злавіла!*** [Янка]: *У чым? Нічога падобнага. Воўсе не злавіла, нічога падобнага.* [Таццяна]: *Ну, добра, я жартую.*

3. [Янка]: *Наўгад. Ты, Млынкоў, памыліўся. У нас нічога такога, да.* [Млынкоў]: ***«Нічога такога»*** *таксама для мяне цікава. Ха-ха! Вось, брат, штука ў чым.*

***ІV. Дыялектызмы.*** У п'есе ўжываецца дыялектная форма жаночага роду, утвораная ад адпаведнай узуальнай формы мужчынскага роду («жаночы род ← мужчынскі род») далучэннем афікса: [Марына]: *Дзень добры, таварышы. Дазвольце да вас гасцей прывесці, з вёскі. Пытаюцца, дзе інтэрнат* (падкрэслівае). *Тут, кажуць, сыны іхнія, двое…* <…> [Маці]: *Ды бачу... самая* ***інтэрнацыя***; [Маці]: *Розныя людзі бываюць, ведаеш, сынок. Пытаемся, дзе* ***інтэрнацыя****…*; [Таццяна]: *Ой, якая сур'ёзная! Вас трэба было б да нас сюды, хоць на тыдзень... у* ***інтэрнацыю***. Дыялектызм *інтэрнацыя* ўтвораны ад скарочанай асновы назоўніка *інтэрнат* пры дапамозе суфікса *-цыј*-а.

Дыялектызмы могуць утварацца ў выніку нерэгулярных фанетычных змен: [Маці (як бы плачучы)]: *Вучыцеся, дзеткі, каб на гэтай самай* ***стрыкацыі****, на* ***лераплані*** –

*у Сібір можна было злётаць...* Тут ужываецца лексічны дыялектызм *стрыкацыя* і яго сінонім – фанетычны дыялектызм *лераплан* (літ. *аэраплан*).

Прыклады іншых фанетычных дыялектызмаў: [Бацька]: *Ды што ж, таварыш прафесар, тут асабліва* ***анцерэснага****, як і ўсе сяляне, так і мы...;* [Маці]: *Каб жа ж у нас ды так ігралі, дзе вы бачылі?* [Бацька]: ***Струмантаў*** *болей. Можа, мы табе, сынок, замінаем тут?;* [Лімпіяда]: *А вось табе і падрыхтоўка: трэба, кажа, цяпер* ***пімпердзікуляр*** *паставіць...* Параўн.: *анцірэс* – 'цікавасць' [2, с. 17], *струмент* – 'інструмент' [3, с. 253]. Варыянт *пімпердзікуляр* (літ. *перпендыкуляр*) узнік у выніку як рэгулярных фанетычных змен (дзеканне: замена [д] на [дз']), так і нерэгулярных (вымаўленне замест галоснага сярэдняга пад'ёму [э'] галоснага верхняга пад'ёму [і], замест пярэднеязычнага санорнага [р] – губнога санорнага [м]).

У маўленні тэхнічнага супрацоўніка Брацянкова ўжываецца форма з прыстаўным [а] – *агармоны* (*гармоны* – 'біялагічна актыўныя рэчывы, якія выдзяляюць у кроў залозы ўнутранай сакрэцыі'): *Ага! Ну, дык ты са мной і не спрачайся. Я ўсё чуў, ведаю. Паслухаць, што цяпер студэнтам расказваюць. Выходзіць па-іхняму, усярэдзіне ў нас* ***агармоны*** *сядзяць*; *Гэта глупства, нічога не значыць, пустата:* ***агармоны*** *сядзяць, сокі выпускаюць, і ад іх гэтага розныя непрыемнасці ў чалавека. Падумаць!*

***V. Антрапонімы.*** Камізм можа заключацца ў адметнай вобразнай аснове прозвішча, тых асацыяцыях, якія яно выклікае: тэхнічны супрацоўнік ***Дзежка***. Супадаючы гучаннем з апелятывам *дзежка* ('драўляная, крыху звужаная к верху пасудзіна з прамых клёпак для заквашвання цеста і інш.'), гэтае прозвішча набывае сэнсавае прырашчэнне '*невысокая, таўставатая* кабеціна'.

Прозвішча *Дубень* (Янка) словаўтваральна суадносіцца з назоўнікам *дуб*, які, апрача нейтральнага («фаўністычнага») значэння, мае і экспрэсіўна зніжанае (пагардлівае) – 'тупы, неразумны чалавек'.

Камізм прозвішча *Бабіновіч* (Васіль) звязаны з тымі асацыяцыямі, якія яно выклікае: *баба* – перан. разм. іран. 'слабахарактарны, нясмелы мужчына'.

***VI. Метанімізмы.*** Камічна насычаныя метанімізмы, якія ўжываюцца ў функцыі зваротка: [Бабіновіч]: *Ну, ідзі,* ***хімія****, выбачся за мяне. Я сам бы пайшоў, ды яшчэ напалохаю дзяўчат.* Тут *хімія* ўжыта як зваротак да Янкі, студэнта хімічнага факультэта.

Назва вучэбнага прадмета можа ўжывацца ў функцыі адмысловага для студэнтаў лаянкавага выразу: [Янка]: *Пайшлі вы ўсе... да* ***арганічнай хіміі,*** *вось што. Мне няма часу.*

***VII. Трасянка.*** Трасянку складае «мноства стыхійна і па-рознаму зрусіфікаваных індывідуальных варыянтаў беларускага маўлення» [4, с. 19]. У трасянкавых ідыялектах «няма пэўнай, аднолькавай прапорцыі беларускіх і рускіх слоў, інакш кажучы, у змяшэнні беларускіх і рускіх моўных элементаў няма узусу» [5, с. 255]. У такім маўленні «русіфікацыя ахоплівае перш за ўсё лексіку, у той час як фанетыка і граматыка захоўваюць сваю беларускамоўную аснову» [5, с. 252]. Яскравы прыклад – трасянкавае маўленне студэнта Сцяпана Гаўрыліка, зацятага рускамоўніка, які, аднак, не валодае як след ні рускай, ні роднай для яго беларускай мовай: *А я гавару:* ***нічэво*** *вы са мной не* ***здзелаеце.*** *Не хачу і не хачу. Адрэжце мне палавіну языка, а я ўсё роўна другой палавінай буду гаварыць* ***па-рускі*** *і* ***зачоты*** *здаваць; Ні душы. Усе там, за сценкай,* ***длінны*** *калідор...* ***Слышыце, іграют...*** *Ну,* ***пасматрыце, как*** *я тут* ***устроілся, вот здзесь...***; ***Нічэво*** *не фу.* ***Какая*** *вы! Проста* ***із*** *манастырскай* ***абіцелі.*** *Фу!* ***Пацалуй – это всё. Без нево – нічэво, пустота.*** *Самае радаснае,* ***остра****-радаснае ў* ***жызні – пацалуй, вот такой, как здзесь***; ***Да, конечно... хотя*** *акцэнт* ***выдает... но*** *я еду ў Сібір,* ***в Цехналагічаскі***; *А пры чым тут зямля? Вы, прабачайце, нічога не разумееце. Я хачу на інжынера вучыцца, тут няма як... А затым...* ***Я ваабшчэ*** *не* ***панімаю****: я пайшоў вучыцца не для таго,* ***што б...*** *я парваў з* ***дзярэўняй*** *і з усім* ***дзеравенскім****, разумееце?* У рускамоўных словах пад уплывам беларускай мовы Сцяпан Гаўрылік вымаўляе зацвярдзелыя [ч] (*ні-*

*чэво, зачоты*) і [р] (*пасматрыце*), тыпова беларускія [дз’] і [ц’], [ў], галосны [а/а’] (а/я; з’ява акання/якання) і інш. Нярэдка ў адным «рускім» слове выяўляецца некалькі беларускамоўных прыкмет: як фанетычных (напрыклад, ***дзярэўняй, ваабшчэ***), так і марфалагічных (напрыклад, *длінн**ы***) або фанетычных і марфалагічных адначасова (напрыклад, ***Цехналагічаскі***).

***VIII. Эўфемізмы.*** Сустракаецца «змякчальны» эўфемізм, асноўнае прызначэнне якога – замяніць эстэтычна непрыстойнае слова семантычна прыдатным спалучэннем слоў: [Брацянкоў]: *Ага! Ага! Сабаку выражаш – не брэша, а чалавеку **тое самае** выраж – забрэша. Што тады?*

***IX. Збыткоўныя адзінкі.*** Прыкладам могуць быць словы-паразіты ў маўленні Брацянкова: ***Н-да... А ўсё ж,*** *таварышы,* ***н-да...*** *у хімічным кабінеце ды гэтую самую зоолёгію разводзіць...* ***н-да...*** *не гадзіцца...*

***X. Комплекснае выкарыстанне вербальных сродкаў камічнага.*** Гэта разнатыпныя вербальныя сродкі, з дапамогай якіх ствараецца насычаны камічны эфект.

1. [Брацянкоў]: *Так, правільна. Ну, а ты, таварыш **Дзежка**, наш мясцкам, бароніш мае **анцірэсы?*** [Дзежка]: *Я? **Ну, наогул** мясцкам... Калі хто цябе пакрыўдзіць на службе, у працы, **ну і наогул... Вядома.*** [Брацянкоў]: ***Наогул? Наогул** мясцкам і **ўсё наогул?*** Вербальныя сродкі камічнага: гаваркое прозвішча *Дзежка* (тэхнічны супрацоўнік), дыялектная форма *анцірэсы* (літ. *інтарэсы*). Рэпліка Дзежкі насычана словамі-паразітамі: часціцамі, пабочнымі адзінкамі, – якія выкарыстоўваюцца адвольна, без патрэбы. Пазбаўленыя сэнсавай нагрузкі, словы-паразіты з’яўляюцца паказчыкам як невысокай маўленчай культуры персанажа, так і яго нізкага інтэлектуальнага ўзроўню. У маўленні Брацянкова гэтыя словы выкарыстоўваюцца з мэтай высмеяць свайго суразмоўніка – Дзежку (*Наогул? Наогул… і ўсё наогул?*).

2. [Сцяпан]: ***Здрасце!*** *Ах, кампанія. І **брацец** тут – **замячацельна, замячательна.** Што вы пішаце, Млынкоў? І **вабшчэ, пачаму вы здзесь сідзіце?*** [Янка]: *А дзе нам сядзець? А дзе ты сядзіш?* [Сцяпан]: *Я... я, так сказаць, **у састаянні стаяння...*** [Янка]: *Не, ты **ў стане сядзення, ды яшчэ між двух крэслаў.*** Камічны эфект дасягаецца ўжываннем інтэрферэм – моўных адзінак са «зрушанымі ў выніку кантакту моў формамі» [7, с. 150]. У маўленні Сцяпана сустракаюцца ўласналексічныя інтэрферэмы, якія характарызуюцца тым, што ў беларускім маўленні ўжываюцца выразы з рускамоўным лексічным складам і ў беларускамоўным графічна-арфаграфічным афармленні: *здрасце!, брацец, замячацельна, вабшчэ, пачаму, здзесь, сідзіце.* Насычанасць рэплікі інтэрферэмамі (кантамінаванымі ўкрапінамі) надае маўленню выразную прыкмету трасянкавасці. Апрача таго, камізм выклікаецца ўжытым без патрэбы фразеалагізмам *так сказаць* (‘калі можна так выказацца’) у значэнні пабочнай адзінкі, адвольным каламбурным абыгрываннем блізкагучных слоў (*у састаянні стаяння...*), іранічнай расшыфроўкай Янкам каламбурнага выразу свайго суразмоўніка: *ты ў стане сядзення, ды яшчэ між двух крэслаў.* Сцяпан зразумеў Янкаў іранічны намёк, пра што сведчыць рэпліка-адказ: *Ах, я ведаю, ведаю, аб чым вы, таварыш Дубень. Пра беларускасць і так далее…*

3. [Янка]: *Ч-чорт ведае, што такое! На якое мне ўсё гэта ліха! Прычапіліся, **халеры спаднічныя!*** [Алесь]: *Ой, пакінь, не магу!* [Бабіновіч (да Янкі)]: *Ды чаго ты разбушаваўся, **як піўныя дрожджы?** Дзяўчаты як дзяўчаты, слаўныя. Наскочылі на нас, як таварышы, проста, без гэтых **сантыментаў**, і правільна адчыталі нас. А ты…* [Янка]: *Без **сантыментаў!** Ды ты што хацеў, каб яны мне **морду** набілі, ці што?* Камічны эфект дасягаецца ўжываннем экспрэсіўна зніжанага прыдатка *халеры спаднічныя* – ‘дзяўчаты’, параўнальнага звароту (ты разбушаваўся) *як піўныя дрожджы*, іранізма *сантыменты* – разм. іран. ‘праяўленне празмернай чуллівасці ў словах, учынках’, зніжанага экспрэсіва *морда* – разм. груб. ‘твар чалавека’.

4. [Алесь]: *Ды не, дзе я мог бачыць, калі? Вось зараз, як скончыў, дык мы з вамі* ***пазаксімся****…* [Тамара]: *Кіньце, Алесь, пра гэта. Мне яшчэ* ***дыплёмку*** *трэба напісаць…* [Алесь]: *Ого! Дык чакаць яшчэ? Мне таксама* ***дыплёмку*** *трэба, разам пісаць будзем…* Вербальныя сродкі камічнага: наватвор *пазаксімся* – ‘зарэгіструем свой шлюб у загсе’, архаізм *дыплёмку* (для сучаснага чытача напісанне і вымаўленне гэтага слова не ўспрымаюцца як натуральныя і таму могуць выклікаць смехавую рэакцыю). Дарэчы, у адпаведнасці з «Беларускай граматыкай для школ» Б. Тарашкевіча [8, с. 126], чужаземныя словы, якія нядаўна ўвайшлі ў беларускую мову, асабліва навуковыя тэрміны, прапануецца перадаваць на пісьме так, як у мове-крыніцы. Гэта датычыць і назоўніка *дыплёмка* (польск. *dyplom* < лац. *diploma*, ад грэч. *diploma* = ліст, складзены ў дзве столкі). У іншаземных словах на пісьме прапануецца еўрапейскае *l* перадаваць праз *л* мяккае. Як адзначаецца ў «Гісторыі беларускай літаратурнай мовы», *l* еўрапейскае – «сярэдняе», яно не адпавядае ні *л* мяккаму, ні *л* цвёрдаму, а таму змякчэнне яго ў тым становішчы, дзе яно немагчымае па законах беларускай мовы, «непазбежна прыводзіла да штучнасці вымаўлення» [9, с. 168].

5. [Млынкоў (напявае)]: ***Дубень*** *Янка* ***алдэгід*** *з* ***хіміяй*** *пад ручку, скуль узяўся Майн Рыд і махнуў анучкай...* Камізм дасягаецца выкарыстаннем гаваркога прозвішча *Дубень* (Янка), недапасаванага прыдатка *алдэгід* (літ. *альдэгід*), метанімізма (з) *хіміяй* (Тамарай Мірчык, студэнткай хімічнага факультэта).

6. [Сцяпан]: *Досыць аднаго* ***братца*** *вам –* ***он будзет сідзець*** *з вамі тут у «роднай» Беларусі, а я,* ***так сказаць, гражданін Вселеннай, так сказаць...*** *Мая* ***родзіна*** *– планета Зямля.* Вербальныя сродкі камічнага: трасянкавае маўленне (элементы: *он будзет сідзець, гражданін Вселеннай, родзіна*), збыткоўныя адзінкі: *так сказаць* (ужываецца двойчы).

7. [Урбановіч]: *Вы мне падабаецеся... разумееце?* [Бабіновіч]: *Разумею...* (Падумаўшы.) *Ах ты, божа ж мой, які я дурны! Гэта ж у такім выпадку трэба нешта рабіць... Пацалаваць трэба!* (Цалуе.) *Ух!* [Урбановіч]: *Ха-ха-ха! Ну, і* ***мядзведзь,*** *праўда,* ***касалапы.*** [Бабіновіч]: *Марыначка! Гэта так, ад засмучэння. Я магу быць лоўкім, спрытным... як... як... ну, словам, я ж вас люблю даўно. Вы самая лепшая дзяўчына!* [Урбановіч]: *У свеце?.. Так? Ха-ха!* [Бабіновіч]: *Не,* ***у гэтым лесе.*** *Ха-ха-ха! Я ведаю добра, што я крыху таго... Таліяй не выйшаў.* У функцыі камічнага ўжываецца выраз *мядзведзь касалапы* – перан. разм. ‘няўклюдны, непаваротлівы чалавек’, гумарызмы (лепшая дзяўчына) *у свеце?* (актуалізатар – выклічнік-рэдуплікат *ха-ха!*), *у гэтым лесе* (паказчык гумарыстычнай канатацыі – трыплікаваны выклічнік *ха-ха-ха!*). Адказ Васіля Бабіновіча – «прыземлены», без рамантычна-ўзнёслай танальнасці. Мабыць, гэта зразумеў і сам персанаж, пра што сведчыць ягоны гучны смех. Дарэчы, на рэпліку-ацэнку Урбановіч Марыны *мядзведзь касалапы* (Бабіновіч насамрэч характарызуецца аўтарам як моцны, нязграбны) у яе «абранніка» таксама не знайшлося іншых слоў, як апраўданне, якое выклікае ў чытача спагадлівую ўсмешку: *Я ведаю добра, што я крыху таго... таліяй не выйшаў.*

Такім чынам, для стварэння камічнага эфекту ў камедыі выкарыстоўваюцца як спецыялізаваныя вербальныя сродкі (каламбуры – паранамазійныя і камбінаваныя; іранізмы, гумарызмы), так і неспецыялізаваныя (дыялектызмы, антрапонімы, метанімізмы, трасянка, эўфемізмы, збыткоўныя адзінкі). Комплекснае ўжыванне вербальных сродкаў садзейнічае стварэнню насычанай камічнай экспрэсіі.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Лаўшук, С. Усё гэта трэба нам / С. Лаўшук // Родная пушча : п'есы, вершы, паэмы, успаміны, лісты / М. Грамыка ; уклад. С.П. Шушкевіча ; аўтар прадм. С.С. Лаўшук. – Мінск : Маст. літ., 1987. – С. 3–14.

2. Яўсееў, Р. Маці казала так...: (з гаворкі Бялыніцкага раёна) / Р. Яўсееў ; рэд. А.А. Крывіцкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 112 с.

3. Расторгуев, П.А. Словарь народных говоров Западной Брянщины / П.А. Расторгуев ; ред. Е.М. Романович. – Минск : Наука и техника, 1973. – 296 с.

4. Мечковская, Н.Б. Языковая ситуация в Беларуси: этические коллизии двуязычия / Н.Б. Мечковская // Сацыякультурная прастора мовы (сацыяльныя і культурныя аспекты вывучэння беларускай мовы) / С.Ф. Іванова, Я.Я. Іваноў, Н.Б. Мячкоўская. – Мінск : Веды, 1998. – С. 5–32.

5. Мячкоўская, Н.Б. Мовы і культура Беларусі : нарысы / Н.Б. Мячкоўская. – Мінск : Права і эканоміка, 2008. – 347 с.

6. Падлужны, А.І. Гукі беларускай мовы / А.І. Падлужны, В.М. Чэкман. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 264 с.

7. Гируцкий, А.А. Белорусско-русский художественный билингвизм: типология и история, языковые процессы / А.А. Гируцкий ; под ред. П.П. Шубы. – Минск : Университетское, 1990. – 175 с.

8. Тарашкевіч, Б. Беларуская граматыка для школ / Б. Тарашкевіч. – 5-е выд. – Вільня, 1929 (факсімільнае выданне: Мінск : Народная асвета, 1991. – 126 с.).

9. Крамко, І.І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : у 2 т. / І.І. Крамко, А.К. Юрэвіч, А.І. Яновіч ; рэд. А.І. Жураўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – Т. 2. – 340 с.

***Rogovtsov V.I.* Verbal Means of Creating a Comic Effect in the Play «Wine Storms» by Mikhaila Hramyka**

Different verbal means, specialized and non-specialized (more often) are used for creating a comic effect in the play. An important role in revealing the comic connotation belongs to special means (means of verbal context); in intensification of such connotation – to intensifiers (a concentrated use of lingual means).

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 06.08.2012